

ЯКУБ БРАЙЦА

ДА СТАГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

У сялянскай сям'і ў вёсцы Забялышына былога Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні 19 лютага 1861 г. нарадзіўся Якуб Раманавіч Брайцаў. Яго бацькі з усіх сіл стараліся, каб як найлепш выхаваць сына, даць яму адукацыю. У роднай вёсцы хлопчык Якуб скончыў пачатковую школу. Пасля вучыўся ў Клімавіцкім павятовым вучылішчы.

Некаторы час пасля вучобы ён працуе памочнікам пісара Забялышынскага валаснога ўпраўлення, а неўзабаве канторшчыкам цукровага завода на Украіне ў памешчыка Цярэшчанкі.

Калі Якубу споўнілася дваццаць год, ён едзе шукаць шчасця ў Маскву. У канторы вядомага ў той час купца-кветкавода Ф. Ноева ён хутка атрымаў пасаду бухгалтара. Адначасова Я. Брайцаў вывучае мастацкую літаратуру, часта наведвае Румянцаўскую бібліятэку і піша аповесць «Багачыха». У гэтым творы пісьменнік праўдзіва адлюстраваў жыццё сялян пасля рэформы на Магілёўшчыне. Акадэмік Я. Карскі ў трэцім томе сваёй работы «Беларусы» адзначыў, што гэта таленавіта напісаная аповесць.

У аповесцях «Паўдняшачка Анюта» (1887), «Старая вёска» і іншых расказваецца пра быт і тыпы Клімаўшчыны. Паказваючы беспрасветную цемру, несправядлівасць, [illegible] пісьменнік ускладвае вялікую надзею на будучыню. Нібы заклікам аптымістычна, радасна, з [illegible] гучаць апошнія радкі аповесці «[illegible]дняшачка Анюта» — «Усё — [illegible] жыццё, а нота — супраць!»

У апавяданні «Юда» (1899), якое аўтар назваў псіхалагічным эцюдам, мы ўжо знаходзім крытыку тагачаснага ладу, філасофскае разважанне аб рэчаіснасці.

У далейшым Я. Брайцаў бярэцца за адвакацкую працу, адначасова вывучае кветкаводства і нават адкрывае ў Маскве магазін па продажу кветак. Але на гандлёвай справе ён хутка прагарэў, страціў усе матэрыяльныя сродкі, што збіраў з вялікімі цяжкасцямі. Зборнік яго апавяданняў ужо быў набраны ў друкарні, праз гэта так і не ўбачыў свету.

Пасля дваццацігадовага пражывання ў Маскве Я. Брайцаў зноў вяртаецца ў родныя мясціны, бярэцца за сельскую гаспадарку, а пасля за адвакацкую працу па сялянскіх справах.

У 1905 г. у часе рэвалюцыйных падзей у пісьменніка знаходзяць нелегальную літаратуру, за што ён і трапляе пад нагляд паліцыі. У гэтыя ж часы ім была напісана камедыя «Была цыганка», у якой расказваецца пра падзеі ў [illegible] ці Беларусі.

Праўдзівыя [illegible] вёскі мастак у [illegible] рэвалюцыйны [illegible] ў рамане «Сярод балот і лясоў» (1913—1916).

Пасля Вялікай Кастрычніцкай [illegible] Я. Брайцаў [illegible] у [illegible] Клімавіцкім [illegible], у дваццатых гадах быў членам калегіі аддзела [illegible] членам [illegible]. У 1925—1928 гг. [illegible] выкладчыкам у [illegible] школе сялян[illegible].

Якуб [illegible] не пакідае літаратур[illegible] артыкулы [illegible], напісаў аповесць «Гаспадар» і шэраг вершаў. Ён быў членам Усерасійскага Саюза сялянскіх пісьменнікаў.

Якуб Брайцаў [illegible] літаратурны шлях тады, калі беларуская мова была забаронена. Таму ён пісаў па-руску. Але свае творы аўтар перасыпаў беларусізмамі («шпацуль», «хараба», «зноглад», «ланцуг», «страха», «здробне», «туга», «жартаваць», «хлопцы», «бульба» і г. д.), беларускімі прыказкамі і прымаўкамі.

Памёр пісьменнік 2 сакавіка 1931 г. у Забялышынскай бальніцы і пахаваны на мясцовых могілках.

Рукапісы пісьменніка знаходзяцца ў яго сына Васіля Якубавіча Брайцава, маскоўскага прафесара.

Варта, каб спадчынай Якуба Брайцава зацікавіліся нашы літаратуразнаўцы, а Цэнтральны архіў [illegible] набыў рукапісы пісьменніка і [illegible] вывучаць [illegible]

Якуб Брайцаў : да стагоддзя з дня нараджэння // Якуб Брайцаў [Папка газетных выразак]. — (Забялышынская СБ).